**Ізергіна Алена Мікалаеўна**
ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі»
e-mail: alena.izergina@gmail.com

## ДА ПЫТАННЯ ІНСТЫТУАЛІЗАЦЫІ САМАІДЭНТЫФІКАЦЫЙНАГА РУХУ БЕЛАРУСАЎ ЛІТВЫ Ў 1990-я гг.

***Анатацыя.*** Працэсы лібералізацыі, якія праходзілі ў СССР у другой палове 80-х гг. XX ст. аказалі ўплыў на беларускую этнічную групу ў Літве. Беларускае насельніцтва, якое пражывала на тэрыторыі Літоўскай ССР, ператварылася ў прадстаўнікоў нацыянальнай меншасці і перайшло ў катэгорыю беларускай дыяспары для сваёй этнічнай радзімы. На кожным з этапаў беларусы стваралі арганізацыі, разнапланавыя па ідэалагічнай скіраванасці, будавалі адносіны са сваёй гістарычнай радзімай.

***Ключавыя словы:*** беларусы Літвы, самаідэнтыфікацыя, перабудова, нацыянальная меншасць, беларуская дыяспара.

**Alena Izerhina**
The Center for the Belarusian Culture, Language and Literature researches
of the National Academy of Sciences of Belarus
e-mail: alena.izergina@gmail.com

## TO THE QUESTION OF THE INSTITUTIONALIZATION OF THE SELF-IDENTIFICATION MOVEMENT OF THE BELARUSIANS OF LITHUANIA IN THE 1900s

***Abstract.*** The liberalization process that took place in the USSR in the latter half of the 1980s had an impact on the Belarusian ethnic group in Lithuania. The Belarusian residents on the territory of the Lithuanian SSR became a national minority and passed into the category of the Belarusian diaspora for their ethnic homeland. At each stage, Belarusians created organizations of different ideological programs and built up relationships with their historical homeland.

***Keywords:*** Lithuanian Belarusians, self-identification, ‘Perestroika’, national minority, Belarusian diaspora.

Геапалітычныя падзеі XX ст. (Першая і Другая сусветныя войны, распад СССР) тройчы змянілі палітычную карту Цэнтральна-Усходняй Еўропы. Пасля абвяшчэння незалежнасці Літвы большасць беларусаў, якія пражывалі у гэтай дзяржаве, прыняла яе грамадзянства, а пэўная колькасць атрымала беларускае. Беларускае

насельніцтва, якое пражывала на тэрыторыі Літоўскай ССР, ператварылася ў прадстаўнікоў нацыянальнай меншасці і перайшло ў катэгорыю беларускай дыяспары для сваёй этнічнай радзімы.

Беларусы Літвы – насельніцтва Літоўскай Рэспублікі, якое мае беларускія карані, і насельніцтва, якое адносіць сябе да беларускага этнасу. Тэрыторыя даследавання – межы сучаснай літоўскай дзяржавы. Крыніцай даследавання сталі матэрыялы архіваў Літвы і Беларусі, а таксама этнаграфічныя запісы, якія былі сабраны аўтарам падчас сустрэч з беларусамі Літвы на працягу 2015–2019 гг. на тэрыторыі Літоўскай рэспублікі. Рэспандэнты прадстаўляюць тры пакаленні жыхароў сучаснай літоўскай дзяржавы: аўтахтоннае насельніцтва (якое нарадзілася на тэрыторыі сучаснай Літвы); насельніцтва, якое пераехала ў пасляваенны перыяд; – другое/трэцяе пакаленне беларусаў, якія нарадзіліся ў Літоўскай рэспубліцы. У 1989 г. згодна даных перапісу ў Літве пражывала 63 тысячы беларусаў, а па звестках перапісу насельніцтва 2001 г. – 42 866 беларусаў [12], згодна перапісу 2011 г. – 36 227 беларусаў [4]. У канцы 2010-х беларусы Літвы з'яўляліся трэцяй па колькасці нацыянальнай меншасцю Літоўскай рэспублікі.

Беларусы, як і іншыя нацыянальныя групы, карыстаюцца роўнымі правамі з усімі грамадзянамі Літоўскай рэспублікі, што было замацавана заканадаўча. У Літве ў 1989 г. быў прыняты і дзейнічаў да 2000 г. прызнаны адным з найбольш дэмакратычных у Еўропе закон аб нацыянальных меншасцях, а ў 2000 г. была падпісана, пазней ратыфікавана Рамачная канвенцыя аб абароне нацыянальных меншасцей [9].

Распад СССР даў імпульс і штуршок для больш актыўнага аб'яднання беларусаў замежжа, стварэння іх грамадскіх арганізацый. На кожным з этапаў беларусы стваралі арганізацыі, разнапланавыя па ідэалагічнай скіраванасці, будавалі адносіны са сваёй гістарычнай радзімай па розных прынцыпах. Найбольш прадуктыўнымі сталі аб'яднанні, мэтай якіх было захаванне культурна-гістарычных традыцый этнічнай радзімы [5, с. 563]. У межах дадзенага артыкула будзе разгледжана дзейнасць беларусаў Літвы ў накірунку інстытуалізацыі самаідэнтыфікацыйнага руху беларусаў ў Літоўскай рэспубліцы ў 1990-х гг.

Працэс этнічнай мабілізацыі беларусаў Літвы звязаны з палітыкай перабудовы. У 1980-я гг. у БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, пачалі заўважацца пэўныя прыкметы лібералізацыі і дэйструкцыі савецкага грамадства. Пачалі ўзнікаць першыя беларускія культурна-асветныя арганізіцыі, актыўна наладжвацца сувязі паміж беларусамі і нават з літоўцамі, прыхільнымі да беларусаў. Не замірала беларускае жыццё ў так званай «Лясной хатцы» Зоські Верас, куды прыходзілі браты Луцкевічы, Мікалай Матач. Да найбольш актыўных беларускіх грамадскіх дзеячоў у Літве у той час неабходна аднесці доктара Валдаса Банайціса, Валянціна Стэха¸ Мікалая Матача, мастакоў Алега Аблажэя і Хрысціну Балаховіч [10, с. 88]. Дзякуючы ім у 1988 г. быў арганізаваны клуб аматараў беларускай народнай творчасці

«Сябрына» [2, Л. 4], створаны хор «Сябрына» пад кіраўніцтвам Ю. Зімніцкага. У 1989 г. было заснавана Таварыства беларускай культуры [2, Л. 10]. Таварыства, як і клуб «Сябрына» займалася адраджэннем беларускай грамадскай дзейнасці, арганізацыяй вечарын, народных і царкоўных свят, сустрэч з беларускімі дзеячамі культуры. Распад СССР і ўтварэнне незалежных дзяржаў сталі ў нейкай ступені штуршком да з’яўлення такой этнічнай з’явы як рэасіміляцыя.

Асаблівасцю захавання і рэпрэзентацыі беларускай культуры ў Літве з’яўляецца яе адраджэнне сімвальнай элітай у гарадскім асяроддзі. У сельскай мясцовасці колькасць беларусаў, якія сябе адносяць да беларускай нацыі, нязначная [7, с. 172]. Адным з важных накірункаў працы беларусаў Літвы стаў пошук, збіранне, захаванне, папулярызацыя нацыянальна-культурнай спадчыны, лепшых набыткаў беларускай культуры. Вялікую даніну павагі ў сувязі з гэтым трэба аддаць надзвычай актыўнай кагорце энтузіястаў – Лявону Луцкевічу, Хведару Нюньку, Лявону Каралю, Юрыю Зімніцкаму, Міраславе Русак, Сцяпану Дуж-Душэўскаму, Мікалаю Рулінскаму, Лявону Мурашку, Галіне Сівалавай, Ліліі Плыгаўцы, Галіне Войцік-Луцкевіч, Аляксею Анішчыку, Сяргею Вітушка, Людвіцы Кардзіс і многім іншым, чыімі намаганнямі ў значнай ступені ішло адраджэнне беларускасці на Віленшчыне і ўсёй Літве [8, с. 7].

Дзякуючы супольным намаганням Таварыства Беларускай культуры ў Літве і клубу «Сябрына» у 1989 г. быў атрыманы дазвол на беларускія перадачы на літоўскім радыё і тэлебачанні: 30 хвілінаў два разы на месяц на радыё і 30 хвілінаў штомесяц на тэлебачанні. З 1990 г. радыёперадача выходзіла рэгулярна штосуботы ў 11.30 на другой праграме Літоўскага радыё і называлася «Беларускае слова на хвалях Літоўскага Радыё». Напрамак перадач – культурна-асветніцкі. Ставілася мэта пазнаёміць слухачоў з дзеячамі беларускай культуры, аднавіць гістарычную памяць; знаёміць з жыццём беларусаў на Радзіме і ў замежжы [3, с. 90–92]. Беларуская тэлевізійная праграма «Віленскі сшытак» на першым канале Літоўскага тэлебачання асвятляла падзеі беларускага жыцця ў Літве [11, с. 109].

З 1997 г. выдаецца газета «Рунь» [1], якая на думку стваральнікаў і супрацоўнікаў «павінна мець характар і дух ня толькі газеты беларускай дыяспары ў Літве, яна мае выдатныя перспектывы зрабіцца «сталічнай» газетай, займець вельмі шырокае кола чытачоў, як у Беларусі, гэтак і далёка за ейнымі межамі» [1]. Сябры рэдакцыі «Руні» намагаліся зрабіць усё, каб яна сталася і формай і зместам менавіта «сталічнай», цікавай шырокаму чытацкаму колу. Былі вызначаны наступныя пастаянныя рубрыкі: «Люстрадзён» адлюстроўвае жыццё і дзейнасць беларускіх суполак, згуртаванняў, арганізацыў у Літве; «Балтыцкі хранограф» асвятляў найбольш значныя грамадзка-палітычныя, культурныя падзеі за месяц у балтыйскім рэгіёне; «Беларускі свет» складаўся пераважна з лістоў, допісаў, цікавых і яркіх фрагментаў дасланых чытачамі газеты; «Постаці» – рубрыка прысвечаная як вядомым, так і малавядомым дзеячам на палітычнай, грамадскай, культурнай, мастацкай,

літаратурнай беларускай ніве з далёкай і блізкай мінуўшчыны; «Успаміны» паўсталі з таго факту, што за час існавання ў архіве рэдакцыі назапасілася багата матарыялаў мемуарнага плану, запісаў, рэдкіх фатаздымкаў, якія раней не друкаваліся; «Літаратура» – літаратарная старонка, дзе друкаваліся кароткія звесткі пра творчасць вядомых беларускіх пісьменнікаў і іх творы [1].

Дзякуючы намаганням актывістаў беларускага руху з 1 верасня 1993 г. пачала працаваць сярэдняя школа з беларускай мовай навучання, якой пасля было прысвоена імя Францыска Скарыны. Першым штуршком для аднаўлення беларускай адукацыі на тэрыторыі Літоўскай рэспублікі стаў пошук сем’яў, якія жадалі аддаць сваіх дзяцей навучацца ў яшчэ не існуючую беларускую школу. Вопытны педагог Галіна Сівалава ўжо ў 1992 г. пачала весці беларускі першы клас пры дзіцячым садку. У 1993 г. пры школе № 13 ужо дзейнічалі 1–4 беларускія класы, а 5–11 класы пры 17-й школе. Пытанне ўласнага будынка для беларускай школы атрымалася вырашыць перад 1993/94 навучальным годам [1].

У 1990-я гг. з’явілася шмат беларускіх арганізацый ў розных гарадах Літвы, якія былі на значнай аддаленасці ад Вільні, узнікла неабходнасць і прагучала прапанова актывістаў аб стварэнні аб’яднання беларускіх грамадскіх арганізацый для каардынацыі іх дзейнасці. У 1995 г. намаганнямі віднага беларускага грамадскага дзеяча С. Дуж-Душэўскага быў скліканы арганізацыйны сход актывістаў беларускага руху, на якім прынялі рашэнне стварыць каардынацыйны орган беларускіх суполак. 22 верасня 1996 г. на ўстаноўчым сходзе прадстаўнікоў беларускіх грамадскіх арганізацый было абрана кіраўніцтва Згуртавання беларускіх суполак, прыняты праект статута. Зарэгістравана Згуртаванне беларускіх грамадскіх арганізацый Літвы (ЗБГАЛ) было 15 студзеня 1997 г. Асноўнымі накірункі дзейнасці згуртавання сталі: захаванне беларускай прысутнасці ў Літве, адраджэнне ў краіне беларускай грамадскай дзейнасці, захаванне і далейшае развіццё беларускай мовы, культуры, беларускіх звычаяў і традыцый, абуджэнне і выхаванне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў [10, с. 90].

Пачаткова ў аб’яднанне ўвайшло 10 беларускіх арганізацый. Кожная з арганізацый мела свае планы дзейнасці, якія каардынаваліся згуртаваннем, але многія культурныя і іншыя мерапрыемствы праводзіліся сумесна: традыцыйнае свята «Купалле», якое арганізоўвалася суполкамі Швянчоніса і «Сябрынай» для ўсіх беларусаў. Адзначаліся гістарычныя даты: 25 сакавіка, 27 лістапада, 6 верасня, дні памяці ахвяраў Чарнобыльскай катастрофы. Адзначаліся юбілеі знакамітых беларускіх грамадскіх дзеячоў, майстроў навукі і культуры, арганізоўваліся выставы мастакоў. Традыцыяй стала Свята беларускай песні [10, с. 90].

Намаганні віленскіх беларусаў былі накіраваны на ўзнаўленне памяці аб вядомых дзеячах беларускага адраджэння. Пры садзейнічанні Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына», іншых структур і асоб усталяваны мемарыяльныя дошкі К. Каліноўскаму, Я. Купалу, В. Ластоўскаму, Б. Тарашкевічу, Р. Шырме. На віленскіх

могілках Роса агульным клопатам беларусаў Вільні, Гданьска і Мінска ў 1995 г. пастаўлены помнік А.Стэповічу, беларускаму кампазітару і грамадскаму дзеячу [10, с. 54]. Асаблівай падзеяй ў жыцці ўсёй беларускай супольнасці Літвы стала адкрыццё 19 лістапада 1999 г. ў г. Шальчынінкай помніка Кастусю Каліноўскаму, у чым вялікую дапамогу аказалі і арганізацыі Рэспублікі Беларусь [10, с. 91; 6].

Такім чынам, уздым беларускага жыцця ў 1990-я гг. у Літоўскай рэспубліцы быў звязаны з пачаткам перабудовы. Для развіцця беларускіх цэнтраў у Літве важнае месца займала палітыка літоўскай дзяржавы, а таксама стабільная грамадска-палітычная і культурная сітуацыя ў Беларусі, зацікаўленасць метраполіі ў захаванні сваіх этнічных асаблівасцяў. Захаванне і распрацоўкі творчай элітай вобразаў мінулага спрыялі кансалідацыі беларускай супольнасці ў Літве і фарміраванню этнічнай ідэнтычнасці розных узроўняў. Важнае значэнне для беларускай этнічнай групы ў Літве займала захаванне гістарычнай памяці. Удзел індывідаў у дзейнасці нацыянальна-культурных суполак забяспечваў падтрыманне сацыяльнай салідарнасці групы і з’яўляўся неабходнай умовай захавання самабытнасці культуры і ідэнтычнасці беларускай супольнасці ў Літве.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Ф. 6. – Воп. 14. – Спр. 232.
2. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Ф. 6. – Воп. 14. – Спр. 226.
3. Войцік, Г. Беларускае слова на хвалях Літоўскага Радыё // Беларусы Былтыі / Рэд. С. Вітушка, А. Мінкін. – Вільня, Выд-ва Т-ва белкультуры «Рунь», 1998. – С. 90–92.
4. Гісторыя беларусаў Літвы // Пасольства Рэспублікі Беларусь у Літоўскай рэспубліцы. – [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://lithuania.mfa.gov.by/be/bilateral_relations/Humanitarian_cooperation/belarusians/history/. – Дата доступу: 16.02.2022.
5. Голубева, Н. Дыяспара // Культура Беларусі: энцыклапедыя. Т. 3. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.). – Мн.: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2012. – С. 561–565.
6. Знакомство с городом Шальчининкай [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://mikby.blogspot.com/2013/06/blog-post.html. – Дата доступа: 16.02.2022.
7. Ізергіна, А. М. Этнакультурныя асаблівасці беларускай этнічнай супольнасці ў Літве / А. М. Ізергіна // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. Вып. 21 / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі; навук.рэд. А. І. Лакотка. – Мн. : Права і эканоміка, 2016. – С. 170–175.
8. Лаўрынавічус, Й. Беларусы Літвы: партрэт у інтэр’еры грамадства / Й. Лаўрынавічус // Голас Радзімы. – № 48–50. – 8.12.2005. – С. 7.
9. Международное сотрудничество // Департамент национальных меньшинств при Правительстве Литовской Республики [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://tmde.lrv.lt/ru/sfiery-dieiatiel-nosti/miezhdunarodnoie-sotrudnichiestvo. – Дата доступа: 18.02.2022.
10. Мурашка, Л. Беларуская прысутнасць у Літве / Л. Мурашка // Беларуская дыяспара як пасрэдніца ў дыялогу цывілізацый / Уклад. Т. Пятровіч. – Мн. : Бел. кнігазбор, 2001. – С. 87–94.
11. Спіс беларускіх суполак Літвы // Беларусы Былтыі / Рэд. С. Вітушка, А. Мінкін. – Вільня : Рунь, 1998. – С. 107–120.

12. Статистика Литвы. Литовский Департамент статистики [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.stat.gov.lt/uploads/docs/2002_11_07.pdf. – Дата доступа: 18.11.2014.
13. Сяргеева, Г. Беларуская дыяспара ў новых незалежных дзяржавах: нацыянальна-культурны аспект / Г. Сяргеева // Весці Акад.навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 1997. – № 3. – С. 52–61.